# «Яблыкі Спаса»

***Не раз я чула пра Зінаіду Паўлаўну Дубовік, жанчыну дзіўнага лёсу і выдатных талентаў: яна і вышывае, і вяжа карункі, і робіць скульптуру малых формаў. Прыехала я да яе ў вёску Гацук на яблычны Спас. Гаспадыня паказвала мне свае вышываныя партрэты Аляксандра Пушкіна, Мігеля Сервантэса, Уладзіміра Караткевіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа — цэлую галерэю вобразаў. І выток, з чаго пачалася творчасць: тры вышываныя іконы Маці Божай. На сценах у рамачках віселі акварэлі, на тумбачках стаялі драўляныя скульптуркі, а на стале на вялікім блюдзе ляжалі спасаўскія яблыкі. Мы гаварылі з Зінаідай Паўлаўнай аб жыцці, яе творчасці, мастацтве. Шчыра скажу, што яе расказ мяне ўразіў. Пазнаёмцеся, калі ласка, і вы з Зінаідай Паўлаўнай Дубовік.***

- Я нарадзілася ў 1940 годзе ў вёсцы Белая Лужа. Адразу ж пасля вайны я захварэла, і ў 1948 годзе мяне накіравалі на лячэнне ў Еўпаторыю. З туберкулёзам пазваночніка, поўнай нерухомасцю тазабедранага і каленкавага суставаў у санаторыі імя Н.К. Крупскай, дзе мяне лячылі, я без руху праляжала на ложку шэсць гадоў. Тады туберкулёз касцей лячылі кансерватыўна, і дзеці былі прькаваны да ложкаў на доўгі час. Сярод іх быў Валерка Дзертынаў, хлопчык-калмык. Ён быў паралізаваны, ляжаў ужо восем гадоў, яму ніхто не дасылаў лістоў, ніхто да яго не прыязджаў. Ад яго адмовіліся бацькі. Я дала сабе слова, што калі-небудзь напішу кнігу пра яго, пра сябе, пра нашы пакуты. У санаторыі я скончыла сем класаў. Вучылася добра, ужо тады любіла маляваць, займалася рукадзеллем - і ўсё гэта лежачы, не ўздымаючы галавы ад падушкі, пераадольваючы няспынны пранізлівы боль во ўсім целе. Але я разумела, што самае цяжкае ў жыцці наперадзе. Слова "інвалід" навечна вісіць на мне, як кляймо, якое ставяць на чалавека другога сорту. Як я жадала, калі чытала казкі Андэрсена, каб дзікія гусі аднеслі мяне на крылах у тую краіну, дзе няма гэтага слова! Туды, дзе ўсе людзі роўныя! Я не хацела быць выгнаннікам...

Выпісалі мяне з санаторыя з тым жа дыягназам. У вёсцы школы не было і я год не вучылася. Маральная абстаноўка, у якой я апынулася, была вельмі цяжкай. Многія лічылі, што было б лепш, каб я памерла, і казалі мне гэта ў вочы. У 1955 годзе я паехала ў Мінск да старэйшай сястры і працягвала вучобу ў СШ № 34. Я ледзь дабіралася да яе. Перасоўвалася з дапамогай мыліц. Вучыцца мне ў звычайнай школе было вельмі цяжка. Адседзець шэсць гадзін за партай з хворым пазваночнікам было проста немагчыма. І таму ў дзесяты клас я не хадзіла, настаўнікі наведвалі мяне дома, за што да канца дзён я буду ўдзячна дырэктару школы Клары Львоўне Бірфус. Я даўно зразумела: для таго, каб жыць, мне трэба быць і Паўлам Карчагіным, і Аляксеем Мярэсьевым.

У Мінску я жыла ў сям' і сястры. Яна з мужам, іх маленькае дзіця і я - усе мы туліліся ў пакойчыку, які сястра здымала ў чужых людзей. У мяне ўсё яшчэ не было групы інваліднасці: ў той час яе давалі толькі тады, калі чалавеку спаўнялася 18 гадоў. Да таго ж, яму патрабавалася два гады працоўнага стажу. А які стаж, калі я толькі што скончыла школу? І я пайшла працаваць спачат/су ў сапожную майстэрню, потым на трыкатажную фабрыку.

У 1961 годзе мне, нарэшце, далі групу інваліднасці, але трэцюю, самую "лёгкую". Кажуць, маладая, хопіць табе і такой групы. А я сама, без чужой дапамогі, не магу ні апрануцца, ні абутак надзець. Транспартам мне таксама карыстацца немагчыма: ступені, прыступкі, лесвіцы - усё гэта для мяне непераадольная перашкода. Так і жыла. Другую групу інваліднасці я атрымала толькі ў 1983 годзе. Тады, у туберкулёзным дыспансэры, мне сказалі: "Трэба было адразу звярнуцца да нас". Але я вырашьша болыш нікуды не хадзіць, не прасіць,

нікому не кланяцца, а прабівацца ў жыцці без пабочнай дапамогі, пакуль змагу. І гэта стала дэвізам майго жыцця.

У 1962 годзе я паступіла ў Мінскае медыцынскае вучылішча №2, якое сюнчыла на "выдатна". Праз два гады пасля яго заканчэння паступіла на завочнае аддзяленне Мінскага педагагічнага інстытута, але не змагла давучыцца. Справа ў тым, што я ўсё яшчэ жыла на кватэры. Свайго жылля не было , і я пачала працаваць на паўтары стаўкі, каб сабраць грошы на кватэру. Але на вучобу ў інстытуце ні часу, ні здароўя ўжо не заставалася. Нарэшце, я свайго дабілася: кватэру набыла.

Але жыць у такім вялікім горадзе, як Мінск, калі табе цяжка зрабіць і крок, вельмі няпроста. І я памяняла мінскае жыллё на Салігорск: горад маленькі, магазіны, праца - усё побач, транспарт не патрэбны. 3 гэтым пераездам я вырашыла многія свае пытанні. У Салігорску я працавала лабарантам у рэнтген-кабінеце раённай бальніцы. У гэты час была нязменным рэдактарам і мастаком насценных часопісаў і стэндаў, займалася рукадзеллем.

На пенсію пайшла рана. у 45 гадоў, у 1988-м. Мой працоўны стаж склаў 25 гадоў. На пенсіі я вырашыла быць бліжэй да прыроды, да зямлі і памяняла гарадскую кватэру на кватэру ў вёсцы Гацук, дзе жыву і сёння. Сям'і ў мяне няма. Я люблю лес, зямлю, кветкі, усё жывое. Мяне лечыць прырода. Усе адмоўныя эмоцыі адыходзяць, як толькі мае рукі дакранаюцца да зямлі. Са мной засталіся мае надзейныя паплечнікі ў жыцці, мая апора - кнігі, музыка, выяўленчае і прыкладное мастацтва. Мой характар, мой унутраны свет фарміраваўся пад уздзеяннем прачытанага і ўбачанага ў класічньгх творах. Я не магла самастойна перайсці вуліцу, але вандравала па ўсяму зямному шару з героямі Жуль Верна, Дзюма, Сервантэса, Гюго. Апошнія гады я вышываю гладдзю партрэты вялікіх людзей, дзеячаў сусветнан культуры, тых, хто ратаваў мяне ў маім горкім адзіноцтве. Вышываю стоячы, пакуль не ацякуць ногі, ці лежачы. Сядзець не магу, пакутую з-за пазваночніка. Нітак для працы купляю шмат, таму што выява чалавечага твару патрабуе да сотні адценняў колеру. Для маіх прац неабходны не толькі спецыяльная тканіна, але і рамкі, і шкло. Усё гэта вельмі дорага каштуе, а ў мяне, акрамя пенсіі, ніякіх даходаў няма.

Два гады таму я вышыла партрэт нашага Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі. Я яго вельмі паважаю. Падумала, ніхто не вышываў партрэтаў ні амерыканскіх, ні расійскіх прэзідэнтаў, а ў нашага, першага беларускага, такі партрэт будзе, ды яшчэ са Случчыны. Нядаўна да мяне прыязджалі тэлевізіёншчыкі, узялі гэты партрэт, абяцалі перадаць Прэзідэнту на дзень яго нараджэння.

Тройчы, з 2000 года, сваімі вышыўкамі ўдзельнічала ў Міжнародным конкурсе "Філантроп", які праходзіць у Маскве. Удзел у такім высокім спаборніцтве дае мне яшчэ адзін шанс — даказаць сабе і людзям, што я жывая, што я не здаюся. Усё сваё жыццё я памятаю прытчу пра двух жабін, якія трапілі ў малако. Яна складзена быццам пра мяне і для мяне. Адна з іх загінула, таму што спужалася, а другая так караскалася ўверх, што збіла ў жбане масла, і таму не патанула, выскачыла наволю.

Цяжка было ў маладосці, але цяпер, калі мне за 60, стала яшчэ складаней. Разуменне таго, што наперадзе амаль нічога няма, прымушае берагчы кожны дзень, кожны час жыцця, надаваць ім высокі кошт. Чалавек жыве, пакуль ён можа працаваць. І таму мой занятак вышыўкай, карункамі, маляваннем - гэта проста прага жьщдя, адзіны спосаб майго існавання як чалавека.

Л. Салодкіна

Слуцкі край. – 2004. – 28 жн.